## Зіновій ПРЫГОДЗІЧ:

# «Наступныя пакаленні ўзбагацяць скарбніцу прыгожага пісьменства новымі таленавітымі творамі»



**Дыханне пакалення адчуваецца ў серыях кніг пісьменніка, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Зіновія Прыгодзіча «Постаці», «Пра літаратуру і літаратараў», «Созидатели»... Праз жыццеапісанні выдатных асоб аўтар асэнсоўвае высокі творчы патэнцыял беларускай нацыі. Быць праваднікам ідэалаў любові да Радзімы, бліжняга – гэта доўг пісьменніка ў эпоху раз'яднанасці пакаленняў, згасання каштоўнасных арыенціраў або натуральная праца таго, хто даследуе «сэрцабіццё мільёнаў» суайчыннікаў? Пра гэта – наша гутарка з Зіновіем Прыгодзічам.**

**– Вы бралі інтэрв'ю ў многіх вядомых дзеячаў культуры, людзей вельмі розных. Хто цяжка ішоў на кантакт, адмаўляўся, а хто, наадварот, лёгка згаджаўся?**

– Вы правільна заўважылі: кожная мая гутарка складвалася па-свойму. І гэта зразумела, бо кожны чалавек мае свой характар, свае асаблівасці, калі хочаце, нават свае мілыя дзівацтвы. І гэта трэба абавязкова ўлічваць. У мяне праблем не было з тымі, каго я даўно ведаў, з кім не адзін год сябраваў. Праўда, на гутарку з мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага народ-

яго галаву не звалілася процьма неадкладных спраў і праблем. І мы прагаварылі з Адамам Восіпавічам з 9 гадзін раніцы да 6 гадзін вечара, з невялікімі перапынкамі на гарбату.

**– Цікавасць да жанру інтэрв'ю з'явілася адразу пасля вучобы на факультэце журналістыкі БДУ ці ў выніку вашай асабістай апантанасці, увагі да жыцця, творцаў, літаратуры, калег? Што стала штуршком?**

– Яшчэ падчас маёй працы загадчыкам кафедры сучаснай літаратуры ў Мінскай партыйнай школе па просьбе слухачоў напярэдадні 40-годдзя Вялікай Перамогі я арганізаваў сустрэчу з Васілём Быкавым, якая прайшла вельмі цікава. На шчасце, яе здагадаліся запісаць, а магнітафонную стужку з гэтым запісам аддалі мне на памяць. Праз пэўны час, ужо ў пачатку новага тысячагоддзя,

**– Што ў вашай працы самае прыемнае, а што – самае складанае, балючае?**

– Калі мець на ўвазе працу над інтэрв'ю, то самае складанае – увайсці з суразмоўцам у цесны кантакт, атрымаць яго поўны давер, і тады гутарка будзе шчырай, змястоўнай, цікавай. Прызнаюся: такі кантакт удавалася знайсці з першай сустрэчы далёка не з кожным героем. А самае непрыемнае ці, дакладней сказаць, тэхнічна нуднае ў гэтай працы – пераводзіць змест гаворкі з дыктафона на паперу. Асабліва калі запіс складае шэсць-восем гадзін. На гэта даводзіцца часам траціць некалькі дзён.

**– Янка Сіпакоў, даючы вам інтэрв'ю, сказаў: «Сэрца – пачатак хвалявання, без якога не можа нарадзіцца ніводзін сапраўдны твор». Калі вы чытаеце сучаснікаў, па чым вызначаеце, што твор напісаны сэрцам?**

***«...Кожная мая гутарка складвалася па-свойму. І гэта зразумела, бо кожны чалавек мае свой характар, свае асаблівасці, калі хочаце, нават свае мілыя дзівацтвы. І гэта трэба абавязкова ўлічваць. У мяне праблем не было з тымі, каго я даўно ведаў, з кім не адзін год сябраваў».***

кніг не было. Таму я выхоўваўся на класічнай беларускай літаратуры – творах Янкі Купалы, Якуба Коласа, Івана Шамякіна, Івана Мележа і іншых.

**– Сёння літаратура больш разнастайная, але ці значыць, што душэўная? Каго б вы вылучылі з сучасных аўтараў?**

– Так, сучасная літаратура непараўнальна больш разнастайная, а ў нечым і больш дасканалая. Але ёй сапраўды не хапае часам той шчырасці і душэўнасці, якія былі ў кнігах савецкага часу. Але гэта, не сумняваюся, праблема часовая. Персанальна некага вылучаць не хацелася б, каб каго не пакрыўдзіць. Гэта – з аднаго боку. А з іншага – мне здаецца, што сёння яркіх, папулярных аўтараў, як было дваццаць-трыццаць гадоў таму, і няма. Але гэта мая асабістая, суб'ектыўная думка.

**– А што наконт вашага запаветнага роднага кутка – Пінскай зямлі?**

– Піншчына не вельмі багатая на літаратурныя таленты. Найперш можна прыгадаць імёны Яўгеніі Янішчыц, Валерыя Грышкаўца, Анатоля Шушко, Марыі Ляшук... З імі я быў не проста знаёмы, а многія гады сябраваў. Пра гэта напісаў цэлы раздзел у кнізе «Там, дзе Вісліца бруіцца» (урывак з яе друкаваўся ў часопісе «Маладосць» № 7 за 2025 год).

**– Усё больш развіваюцца но-**

з мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Міхасём Дрынеўскім рашыўся не адразу. Аказваецца, пра чалавека, якога даўно і добра ведаеш, пісаць не лягчэй, а можа, нават цяжэй. Таму што пра многае з ім ужо перагаворана, шмат абмеркавана, пытанні для яго трэба падбіраць новыя, арыгінальныя.

Ад сустрэчы не адмаўляўся ніхто. Згаджаліся ўсе: хто – больш ахвотна, хто – менш, хто – з некаторымі ўмовамі. Я вельмі хваляваўся, калі тэлефанаваў сусветна вядомаму балетмайстру, мастацкаму кіраўніку нашага Вялікага тэатра оперы і балета, народнаму артысту СССР Валянціну Елізар'еву. На дзіва, ён пагадзіўся адразу, прызначыў дзень і час сустрэчы. Больш за тое, мы сустракаліся з ім чатыры разы запар. І пры ўсёй сваёй занятасці Валянцін Мікалаевіч удзяляў мне па паўтары-дзве гадзіны кожны раз. Тое ж самае было з Аляксандрам Анісімавым, з якім мы сустракаліся ажно пяць разоў. Цяжэй было сустрэцца з вядомым беларускім літаратуразнаўцам, пісьменнікам Адамам Мальдзісам. Не, ён не адмаўляўся, але з гумарам гаварыў: «Калі вы мне надточыце суткі на некалькі гадзін, то гэты час я ахвотна аддам вам». Амаль паўгода мы ніяк не маглі вызначыцца з сустрэчай. Нарэшце ён прызнаўся, што больш цягнуць ужо няёмка, і прызначыў мне спатканне 2 студзеня, на другі дзень новага года, калі яшчэ на памяць. Праз пэўны час, ужо ў пачатку новага тысячагоддзя, я ўспомніў пра яе, паслухаў запіс і зразумеў, што ўсё, пра што гаварыў Быкаў, не страціла сваёй актуальнасці. І прапанаваў галоўнаму рэдактару часопіса «Полымя» Мікалаю Мятліцкаму надрукаваць адпаведную гутарку. «Прынось, – сказаў ён. – Калі будзе цікава, апублікуем». Матэрыял неўзабаве быў надрукаваны. Падпісваючы яго ў друк, Мікалай Міхайлавіч нечакана прапанаваў: «А чаму б табе не зрабіць цыкл такіх гутарак і назваць іх "Постаці". Гэта мяне вельмі натхніла, і я на працягу дзесяці гадоў зрабіў і часткова апублікаваў у «Полымі» больш за трыццаць інтэрв'ю. Пазней яны з блаславення вядомага пісьменніка Алеся Карлюкевіча ўвайшлі ў трохтомнік «Постаці». Алесь Мікалаевіч зрабіў да кожнага тома і грунтоўную прадмову.

Як нарадзілася серыя «Созидатели»? Шчыра прызнаюся: гэта не мая ідэя. Падчас шматлікіх сустрэч з чытачамі выказваліся пажаданні выдаць гутаркі і на рускай мове. Пра гэта мне неаднойчы казалі і супрацоўнікі бібліятэк. І я вырашыў пайсці ім насустрач. Але «Созидатели» – не проста пераклад «Постацей». Для новай серыі ранейшыя публікацыі былі абноўлены, дапрацаваны і дапоўнены новымі гутаркамі, якіх набралася больш за дваццаць. І такім чынам трохтомнік вырас у пенталогію.

**це сучаснікаў, па чым вызначаеце, што твор напісаны сэрцам?**

– Некалі Леў Талстой, гаворачы пра мастацтва, галоўную сутнасць яго вызначыў так: праз мастацкі твор заразіць сваімі эмоцыямі, пачуццямі іншых. Вось калі аўтару гэта ўдаецца, значыць, яго твор напісаны сэрцам. А сэрца не падманеш.




**– На напісаным сэрцам выхоўвалася не адно пакаленне. Напрыклад, на кнізе «Дзікі сабака Дынга». А на якіх кнігах выраслі вы?**

– На жаль, у мой час – а гэта былі пяцідзясятыя-шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя – у нашай сельскай бібліятэцы, а тым больш у школьнай, падобных

се «Маладосць» № 7 за 2025 год).

**– Усё больш развіваюцца новыя тэхналогіі, у прыватнасці, набірае абарот трохмерная візуалізацыя. Кніга ёй прайграе ці выйграе?**

– У гэтых адносінах кніга, канешне, у многім прайграе. Трохмерная візуалізацыя асабліва падабаецца дзецям, моладзі. Але гэта не значыць, што кніга знікне. Яна набудзе іншыя якасці: стане менш масавай (ужо становіцца), але больш дасканалай у паліграфічным выкананні, больш прывабнай у мастацкім афармленні. Акрамя таго, друкаваная кніга захавае сваю галоўную і вельмі важную перавагу – уласцівасць няспешнага чытання, якое заўсёды выклікае ў чытача пэўны роздум, абуджае, развівае фантазію. А гэтыя якасці патрэбны ў любой прафесіі.

**– За што вы ўдзячны лёсу і што не можаце прыняць? Якая будучыня ў беларускай літаратуры?**

– Лёсу я ўдзячны перш за ўсё за тое, што ён даў мне магчымасць у меру сваіх сіл служыць яго Вялікасці Слову. А што тычыцца лёсу беларускай літаратуры, то я веру ў яе шчаслівую будучыню. Мастацтва, як вядома, развіваецца хвалепадобна. І таму за сённяшнім пэўным спадам абавязкова наступіць уздым, і наступныя пакаленні скарбніцу прыгожага пісьменства ўзбагацяць новымі, таленавітымі творамі.

**Гутарыла Наталля СВЯТЛОВА**
**Фота Кастуся ДРОБАВА**